і ніякага роду ў формах творнага і меснага склонаў? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».

Настаўнік дае заданне прачытаць матэрыял рубрыкі на старонцы 17 і праверыць правільнасць выказаных меркаванняў. Потым ён задае пытанні вучням:

— Калі прыметнікі ў формах мужчынскага і ніякага роду творнага і меснага склонаў маюць канчатак ***-ым (-ім)***?

Практыкаванне 28.

— Спішыце спалучэнні слоў. Выдзеліце канчаткі ў прыметніках і вызначыце іх склон. (Запіс з каменціраваннем.) З адным спалучэннем слоў на выбар складзіце сказ. (Выслухоўваюцца адказы вучняў.)

**IV. Замацаванне.**

Практыкаванне 29.

— Прачытайце спалучэнні слоў. Назавіце канчаткі прыметнікаў. Замяніце прыметнікі на супрацьлеглыя па значэнні. Назавіце новыя спалучэнні слоў. Дапоўніце сказы патрэбнымі спалучэннямі слоў. (Запіс сказаў з каменціраваннем, вызначэнне роду і склону прыметнікаў *смачным, мяккім, вясёлым*, выдзяленне ў іх канчаткаў.) Запішыце сказы. (Запіс з каменціраваннем, вызначэнне роду і склону прыметнікаў у сказах.)

Рубрыка «Гаварыце правільна!».

— Прачытайце словы ў рубрыцы на старонцы 18. Звярніце ўвагу на націск у іх. Я буду называць прыметнікі, а вы знайдзіце да іх антонімы сярод слоў, змешчаных у рубрыцы. (Настаўнік называе прыметнікі: *чужым, вялікім, маладым*.)

Практыкаванне 30.

— Прачытайце. (Вучні чытаюць незакончаныя выказванні самі сабе.) Якое выказванне з'яўляецца памылковым? *(Першае.)* Якое выказванне правільнае? Чаму? Прадоўжыце правільнае выказванне. (Вучні складаюць працяг выказвання: у спалучэннях слоў *у родным доме* і *над родным домам* прыметнік мае аднолькавыя канчаткі, таму што ў формах мужчынскага роду творнага і меснага склонаў прыметнікі маюць аднолькавыя канчаткі.) Які канчатак мае прыметнік *родным* у гэтых спалучэннях слоў? ***(-ым)***

**V. Дамашняе заданне.**

Практ. 31.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе дапоўніць сказы тэксту прыметнікам *сасновы* ў патрэбнай форме склону і запісаць іх. Акрамя таго, трэба будзе вызначыць род і склон гэтага прыметніка ў сказах, выдзеліць канчаткі ў розных яго формах.

**VI. Вынік урока.**

— Якія канчаткі маюць прыметнікі ў формах мужчынскага і ніякага роду творнага і меснага склонаў? Калі пішацца канчатак ***-ым (-ім)***? Як адрозніць прыметнікі ў формах мужчынскага і ніякага роду творнага і меснага склонаў?

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бяспалы, Зм.* Русачок і Белячок : казкі / Змітро Бяспалы. Песня івалгі : апавяданні : для малод. шк. узросту / Рыгор Ігнаценка; маст. У. В. Гладкевіч. — Мінск : Юнацтва, 1998. — 109 с.: іл.
2. Вясёлка. — 2013. — № 10. — С. 21.

**Крыніцы ілюстацый:** http://juicep.ru/wp-content/uploads/2017/12/8-1.jpg; https://img1.liveinternet.ru/images/attach/c/2//73/1/73001559_79979bd1f5bf460c5b43c25534f.jpg.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### *Акварыум*

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 3 | 2 | 1 | 4 | 7 | 6 | 5 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| в | к | а | а | у | ы | р | м |

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

ў у

аквары[..]м

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*3. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і дапішыце патрэбныя словы. Зафарбуйце радок, у які ўпісана слоўнікавае слова.*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | к | в | а | | | | м | | |
| а | к | в | а | | | | | н | ы |

*Дапоўніце гэтымі словамі верш:*

_________ыя рыбкі
У ___________е Міла
Рыбак кожны дзень карміла.
Ды ў ___________е рыбкі
падрасталі штосьці не шыбка.
*(Анатоль Зэкаў* [1, с. 56]*)*

***Шыбка** — тут:* ***хутка.***

*Якое захапленне ёсць у Мілы?*

*4. Дапоўніце верш слоўнікавым словам. Каго нагадвае сомік?*

**Сомік**

У ___________е сомік
носам тыцкаецца ў шыбку
так пацешна, нібы гномік.
Палюбуйцеся на рыбку!
*(Данута Бічэль-Загнетава* [2, с. 20]*)*

***Шыбка** — тут:* ***шкло, з якога зроблены акварыум.***

*5. Прачытайце верш. Дапішыце ў слоўнікавае слова прапушчаную літару.*

У акварыу..ме гупі
Падабаецца быць групай.
Між раслінаў, як нідзе,
Ім так хораша ў вадзе.
*(Міхась Пазнякоў* [3, с. 225]*)*



***Гупі** — акварыумная рыба.*

*Разгледзьце малюнак. Апішыце, як выглядае гупі.*

### *Дзверы*

*1. Разблытайце «павуціну» і запішыце слоўнікавае слова.*




*Запішыце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове.*

*2. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

**Два браты**

Гучна — «ба-бах!» —
__________ адкрытыя.
Жаласна — «дзінь!» —
шклянка разбітая.

Зноўку бягуць —
з гіканнем, тупатам.
Падаюць, коцяцца.
Ой! — з грукатам.
*(Таццяна Мушынская* [4, с. 28]*)*

*Выберыце словы, якімі можна апісаць братоў:*

Веселуны, ціхоні, непаседы, балаўнікі, свавольнікі, разумнікі.

*3. Прачытайце загадку. Дапішыце прапушчанае слоўнікавае слова.*

Дом на рэйках падкаціў,
__________ шчыра адчыніў.
Той, хто едзе, паспяшай,
Не затрымлівай _______________.
*(Міхась Пазнякоў* [3, с. 225]*)*

*Запішыце слова-адгадку.*

*4. Дапоўніце скорагаворку слоўнікавым словам. Навучыцеся правільна яе вымаўляць.*

__________ састарэлі: рыпелі і скрыпелі.
*(Анатоль Клышка* [5, с. 13]*)*

*5. Прачытайце загадку.*

Стаяць навідавоку.
Цераз парог — ні кроку.
*(Анатоль Клышка* [6, с. 41]*)*

*Запішыце слова-адгадку.*

### *Дождж*

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*

 **,** **ЖДЖ**

*2. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі:*

Вялікі _______ — гэта лівень.
Маленькі дождж — гэта _________.

*3. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

__________ да раніцы ішоў,
раніцай —
стаміўся:
пэўна, спачываць пайшоў,
бо за ноч —
стаміўся.
*(Мікола Чарняўскі* [7, с. 7]*)*

*4. Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.*

Ён раптам зашумеў:
— Шу-шу.
Забарабаніў па страсе.
Калі прыйшоў, пачулі ўсе.
Калі пайшоў, ніхто не чуў. ________
*(Уладзімір Мацвеенка* [8, с. 60]*)*

*5. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Па-над полем беглі хмары,
Гром у бубен гучна ўдарыў.
І пусціўся басанож
Танцаваць блакітны __________.

*(Міхась Пазнякоў* [3, с. 177]*)*

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літару, якая абазначае галосны гук.*

*6. Прачытайце скорагаворку. Устаўце ў слоўнікавае слова прапушчаныя літары.*

Зранку цэлы дзень
Дож__ па вуліцы ідзе.
Дож__ руплівы, палівай! —
Слаўны вырасце ўраджай.

*(Міхась Пазнякоў* [3, с. 183]*)*

*Навучыцеся правільна вымаўляць скорагаворку.*

## *Рукзак*

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слова, якое ў вас атрымалася.*




*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

К Г

ру..зак

*3. Гульня «Лесвіца». «Спусціцеся» па лесвіцы і дапішыце патрэбныя словы.*

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *р* | *у* | | | *к* | | | |
| *р* | *у* | | | *ч* | *о* | *к* | |

*Дапоўніце сказ слоўнікавым словам:*
Жэня склала кнігі, сшыткі і пенал у __________ .

*4. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*
Маленькі _________ — гэта рукзачок.
*Запішыце сказ пад дыктоўку настаўніка.*

*5. Прачытайце загадку.*

Ці малы я, ці вялікі —
Ды заўсёды ўсё ж мяне
Людзі носяць
На спіне.

*(Міхась Пазнякоў* [9, с. 135]*)*

*Запішыце слова-адгадку.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Зэкаў, А.* Кенгуру ці кенгура? : казкі і вершы : для мал. шк. узросту / Анатоль Зэкаў. — Мінск : Нар. асвета, 2013. — 94 с.
2. *Бічэль-Загнетава, Д. І.* Гараднічанка : вершы / Данута Бічэль-Загнетава. — Мінск : Юнацтва, 1993. — 48 с.
3. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
4. *Мушынская, Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апавяданні, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Таццяна Мушынская ; мастак Г. С. Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Литература и Искусство, 2008. — 136 с.
5. *Клышка, А. К.* Прыгаршчы языкаломак / А. К. Клышка. — Мінск : Народная асвета. — 2011. — 31 с.
6. *Клышка, А. К.* Тысяча арэшкаў : загадкі для дзяцей і дарослых / А. К. Клышка. — Мінск : Народная асвета, 2012. — 127 с.
7. *Чарняўскі, М. М.* Едзе вожык на кані : прымаўлянкі-забаўлянкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Мікола Чарняўскі ; маст. Вольга Якубоўская. — Мінск : Звязда, 2016. — 16 с. : іл. — (Вясёлы калейдаскоп).
8. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка : вершы, загадкі, казкі : для малод. шк. узросту / У. І. Мацвеенка ; маст. А. І. Гармаза. — Мінск : Юнацтва, 1995. — 127 с.
9. *Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / Міхась Пазнякоў ; маст. Сяргей Волкаў. — Мінск : Литература и Искусство, 2009. — 144 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://aquadiletant.ru/uploads/store/d5/86/b5/d5d86bb5757ee7c713564e476b82f6c2.JPG; http://igraem.pro/wp-content/uploads/2011/05/home1.jpg; https://avatars.mds.yandex.net/get-pdb/963327/4a2491a6-dd18-47df-b2ce-76197d854b03/s1200; https://wordassociations.net/image/200x/svg_to_png/piotr_halas_padlock.png.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*